**Праспэкт выданьня**
**спадчыны архіяпіскапа Мікалая Мацукевіча**
**ў 3-х тамах**

Думка пра выданьне спадчына архіяпіскапа Мікалая (Мацукевіча), першагіерарха Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў замежжы, паўстала ў Беларускім Інстытуце Навукі і Мастацтва ў Нью Ёрку ў травені 2003 годзе. Была яна адначасна водгукам на ініцыятыву царкоўнага актыву парафіі Сьв. Кірылы Тураўскага БАПЦ у Таронта (Канада), перадусім сьв. пам. Марыі Ганько, каб памяць пра выдатнага беларускага царкоўнага дзеяча й патрыёта ўшанаваць кніжнай публікацыяй.

На працягу 2003 – 2007 гадоў у часе шэрагу спатканьняў і размоваў, удзел у якіх прымалі д-р Я. Запруднік, д-р В. Кіпель, сябра Рады БАПЦ Алекс Сільвановіч і Ю. Гарбінскі разглядалася-абмяркоўвалася й выпрацоўвалася канцэпцыя і структура такой публікацыі. Яе назва –“У малітве за Беларусь” – была запрапанавана сьв. пам. Алексам Сільвановічам.

Паводле “Тэстамэнту”, які архіяпіскап Мікалай (Мацукевіч) аформіў 8 красавіка 1999 году ў Таронта, яго архіў і бібліятэка пасьля сьмерці передаваліся ў БІНіМ. У вышэйзгаданым дакуманце, згодна з пажаданьнем гіерарха, сярод іншага было адзначана наступнае:

„TO GIVE all my private letters (my archives) and all my books, except for the “Church Service Books” located at the Belarusan Autocephalous Orthodox Church, Parish of St. Kiryla of Turau in Toronto, Ontario (hereinafter called the “Belarusan Toronto Church”), to the Belarusan Institute of Arts and Sciences in New Brunswick, New Jersey, U.S.A. **(1)**.

У чэрвені – ліпені 2004 году ў царкве Сьв. Кірылы Тураўскага БАПЦ у Таронта Ю. Гарбінскім быў зроблены прагляд двух архіваў – архіяпіскапа Мікалая (Мацукевіча) і архіяпіскапа Васіля (Тамашчыка). У ліпені 2005 году пры ўдзеле сяброў царкоўнага актыву БАПЦ А. Сільвановіча й С. Трыгубовіча яны былі перавезены ў Гайленд Парк (Нью Джэрзі, ЗША).

Шырэйшае знаёмства з архівамі абодвух беларускіх гіерархаў і каштоўнасьць выяўленых матар’ялаў, (дакумантаў, лістоў, дзёньнікаў, рукапісаў, фотаздымкаў і інш.) задэцыдавалі пра патрэбу іх публікацыі ў кшталце 3-х томнага выданьня.

--------------

(1) Copy of the Last Will and Testatment of Michael Macukievich also as Archbishop Mikalay. Dated: April 8, 1999, p. 2.

Зьмест кожнага з 3-х тамоў выглядае наступным чынам:

**Том 1.Творы:**

Уступнае слова В.Кіпеля.
Прадмова Ю.Гарбінскага.

Разьдзел I: Малітвы й пропаведзі (1957 – 1992).
Разьдзел II: Архіпастырскія пасланьні й лісты (1981 -2002).
Разьдзел III: Гісторыка-культуралягічная праца “Мястэчка Моталь”.
Разьдзел IV: Публіцыстыка (1953 – 2001).
Разьдзел V: Успаміны.
Разьдзел VI: Успаміны пра архіяпіскапа Мікалая (Мацукевіча):
Кастусь Акула, Ірына Варабей, Марыя Ганько, Вольга Грыцук, Надзя Дробіна, Раіса Жук-Грышкевіч, Янка Запруднік, Вітаўт Кіпель, Барыс Кірка, а. Георгі Латушка, Антон Маркевіч, пастар Юрка Рапэцкі, а. Вассо Раяк, Рыта Рудніцкая, Алекс Сільвановіч, Валянціна Трыгубовіч, Анатоль Хрэноўскі, Зьміцер Эляшэвіч.
Разьдзел VII: У люстэрку часу.
Зьмяшчае багатую і ўнікатовую фотакалекцыю, якую склалі здымкі, зьвязаных з жыцьцём і сьвятарскім пакліканьнем архіяпіскапа Мікалая (Мацукевіча). Большасьць зь іх друкуецца ўпершыню.

Пасьляслоўе Я.Запрудніка.

Камэнтары.
Бібліяграфія.
Скароты.
Паказьнік асобаў.

**Том 2. Ліставаньне:**

Уступнае слова В.Кіпеля.
Прадмова Ю.Гарбінскага.

Разьдзел I. Ліставаньне зь гіерархамі БАПЦ:
архіяпіскап Сергій (Ахаценка),
архіяпіскап Васіль (Тамашчык),
мітрапаліт Андрэй (Крыт).

Разьдзел II. Ліставаньне зь беларускім царкоўным актывам у Аўстраліі:
а. А. Кулакоўскі
У. Акавіты
М. Лужынскі
М. Нікан
М. Раецкі
М. Скабей
К. Станкевіч

Разьдзел III. Ліставаньне зь беларускім царкоўным актывам у Бэльгіі:
а. А. Смаршчок.

Разьдзел IV. Ліставаньне зь беларускім царкоўным актывам у Вялікабрытаніі:
а. Аляксандар Крыт
А. Лашук

Разьдзел V: Ліставаньне зь беларускім царкоўным актывам у ЗША:
а. Я. Бруцкі,
а. В. Войтанка,
а. В. Кендыш,
а. К. Стар,
а. А. Яноўскі,
М. Белямук,
В. Гарошка,
М. Гарошка,
Б. Данілюк,
У. Дунец,
Я. Запруднік,
М. Куліковіч,
А. Міцкевіч,
М. Міцкевіч,
В. Русак,
К. Якуб.

Разьдзел VI. Ліставаньне зь гіерархамі й сьвятарамі іншых цэркваў:
мітрапаліт Міхаіл (Фэдук),
мітрапаліт Філарэт (Вахрамееў),
а. Канстанцін Бандарук,
пастар Я. Пятроўскі,
пастар Ю. Рапэцкі.

Разьдзел VII. Ліставаньне зь беларускімі й грамадзка-культурнымі дзеячамі:
А. Адамовіч,
Н. Арсеньнева,
Т. Бэрд,
А. Варонка,
Ю. Віцьбіч,
Р. Жук-Грышкевіч,
Я. Запруднік,
В. Кіпель,
З. Кіпель,
М. Прускі,
В. Сёмуха.

Камэнтары.
Бібліяграфія.
Скароты.
Паказьнік асобаў.

**Том 3.**

Уступнае слова В.Кіпеля.
Прадмова Ю. Гарбінскага.

Беларускі імёньнік
Кароткі беларускі тэрміналягічны царкоўны слоўнік.
Слоўнік сваяцтва.
Дадаткі.

Камэнтары.
Паказьнік асобаў.

Глыбока сімвалічна, што першы том спадчыны першагіерарха БАПЦ архіяпіскапа Мікалая (Мацукевіча) выйшаў у 100-я ўгодкі з дня яго нараджэньня.

Люблін – Менск, 03.05.2017 г.

Юры Гарбінскі